***Сяргей Хоміч***, *аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

# Фарміраванне тэрыторыі БССР (1919—1926)

Тэрыторыя — неабходная ўмова і адзін з важнейшых паказчыкаў існавання незалежнай дзяржавы. Тэрытарыяльнае пытанне ўзнікае разам з самой дзяржавай і носіць адбітак усіх тых умоў, што спадарожнічалі яе ўтварэнню. Менавіта таму даследаванне працэсу будаўніцтва дзяржавы немагчыма ўявіць без глыбокага вывучэння таго, як адбывалася ўстанаўленне яе граніц.

Праблема вызначэння тэрыторыі Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы Беларусі набыла актуальнасць адначасова з усведамленнем у ЦК РКП(б) неабходнасці абвяшчэння Беларускай рэспублікі. Напрыканцы 1918 г. пытанне аб утварэнні БССР вырашалася з маланкавай хуткасцю. Такое тэрміновае ўтварэнне Беларускай рэспублікі тлумачылася толькі складаным знешнепалітычным становішчам, у якім апынулася савецкая дзяржава, а перспектыва самой Беларусі ў поглядах партыйнага кіраўніцтва цесна звязвалася з развіццём рэвалюцыйных падзей у Польшчы і Германіі.

У канцы снежня 1918 г. паражэнне паўстання ў Германіі і адсутнасць умоў для рэвалюцыі ў Польшчы сталі відавочнымі. У Польшчы ў выніку дзяржаўнага перавароту да ўлады прыйшлі рэакцыйныя сілы, якія пры падтрымцы Антанты і ЗША ўзялі курс на падрыхтоўку ваеннай інтэрвенцыі ў Савецкую Расію. У такой сітуацыі ЦК РКП(б) прыйшлося тэрмінова выпрацоўваць новую палітыку: палітыку абароны, у адпаведнасці з якой Беларусь павінна была стаць апошнім звяном у ланцугу незалежных савецкіх рэспублік, якія маглі б аддзяліць Савецкую Расію ад капіталістычных краін. Адначасова існаванне на захадзе самастойных рэспублік не толькі



аддзяляла Савецкую Расію ад капіталістычных краін, але і давала магчымасць у выпадку інтэрвенцыі весці ад іх імя актыўную дыпламатычную дзейнасць. Як бачым, БССР стваралася зыходзячы са знешнепалітычных задач, а этнічныя, эканамічныя, культурныя і іншыя аспекты да ўвагі не прымаліся. Гэта, у сваю чаргу, і абумовіла вырашэнне тэрытарыяльнага пытання.

Упершыню беларускае тэрытарыяльнае пытанне было закранута ў вядомай размове І.Сталіна з А.Мясніковым. Наркам па справах нацыянальнасцяў, пералічваючы губерні, якія павінны былі перайсці ў падпарадкаванне беларускаму ўраду, «забыў» назваць Магілёўскую і Віцебскую губерні [5, с. 414]. Магчыма, ужо на той час у яго была ідэя ўтварэння беларускай дзяржавы ў абмежаваным складзе. Аднак ні кіраўніцтва аблвыканкамзаха, якое атаясамлівала БССР з Заходняй вобласцю, толькі пад другой шыльдай, ні Белнацкам, які верыў у сапраўдную незалежнасць Беларускай рэспублікі, не пагадзіліся б на такі варыянт. Між тым трэба было спяшацца, і І.Сталіну прыйшлося часова саступіць. У заключаным з кіраўніцтвам Заходняй вобласці пагадненні, вядомым у гістарычнай літаратуры як «шэсць пунктаў І.Сталіна», адзначалася, што «ў склад рэспублікі ўваходзяць губерні: Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Віцебская і Смаленская». Апошняя губерня з'яўлялася спрэчнай, і яе лёс павінны былі вырашыць мясцовыя ўлады [10, с. 148].

Такім чынам, І з'езд кампартыі Беларусі, які абвясціў стварэнне БССР, меў справу з ужо гатовым рашэннем вышэйшага партыйнага органа. Делегаты з'езда пастанавілі, што ў склад Беларускай рэспублікі павінны ўвайсці Мінская, Магілёўская і Гродзенская губерні поўнасцю, амаль уся Віцебская губерня без частак трох паветаў, а таксама пяць паветаў Смаленскай губерні, чатыры паўночныя паветы Чарнігаўскай губерні і па адным павеце з Віленскай і Сувалкаўскай губерняў [11, с. 33].

Аднак у такіх граніцах «незалежная» Беларуская рэспубліка праіснавала нядоўга. Ужо ў сярэдзіне студзеня 1919 г.



Created by free version of DocuFreezer

ЦК РКП(б) прызнаў неабходным вывесці са складу БССР Смаленскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні, пакінуўшы толькі Мінскую і Гродзенскую. Вырашэнне тэрытарыяльнага пытання з боку цэнтральных расійскіх органаў абумоўлівалася дзвюма асноўнымі прычынамі. Па-першае, у пачатку 1919 г. Польшча ўсё мацней і мацней заяўляла аб сваіх прэтэнзіях на беларускія землі. Савецкі ўрад імкнуўся пазбегнуць ваеннага канфлікту. Польшчы прапаноўваліся мірныя перамовы і вырашэнне ўсіх спрэчных тэрытарыяльных пытанняў на яе карысць. Кіраўніцтва Літоўскай рэспублікі на адным са сваіх пасяджэнняў адзначала, што «імперыялістычныя апетыты самой Польшчы несумненна могуць быць задаволены Савецкай Расіяй за дыпламатычным сталом, і дзеля гэтага ёй не спатрэбяцца перамогі на палях бітваў» [1, спр. 4, а.52]. Зразумела, што маючы магчымасць ахвяравання беларускімі землямі, бальшавікі не хацелі рызыкаваць усімі тэрыторыямі, заўчасна ўключыўшы большую іх частку ў склад РСФСР. Другой прычынай «абмежавання памераў Беларускай рэспублікі геаграфічна неабходнымі граніцамі» стала жаданне ЦК РКП(б) аслабіць у рэспубліцы нацыянальныя тэндэнцыі. Аб гэтым рашэнні ЦК і яго прычынах членам ЦБ КП(б)Б было паведамлена 10 студзеня 1919 г. паўнамоцным прадстаўніком ЦК РКП(б) А.Іофе [1, спр. 2, а.20].

Ідэя абмежавання тэрыторыі рэспублікі не была ўспрынята ні групай А.Мяснікова, якая разглядала гэты акт як ліквідацыю Заходняй вобласці і абвінавачвала кіраўніцтва партыі ў залішняй цэнтралізацыі і бюракратызацыі, ні групай Жылуновіча, чыя зорка як старшыні Беларускага ўрада ўжо заходзіла. Паездка дэлегацыі ад ЦБ КП(б)Б у Маскву з просьбай перагледзець рашэнне аказалася беспаспяховай. У.Ленін, які прыняў прадстаўнікоў беларускага ўрада, адказаў ім, што рэспубліка патрэбна пастолькі, паколькі яна мяжуецца з іншымі краінамі. А паколькі Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні не маюць агульных граніц з суседнімі дзяржавамі, то іх са складу БССР можна выключыць



[9, с. 133]. Там жа, у Маскве, беларускай дэлегацыі паведамілі яшчэ аб адным рашэнні ЦК РКП(б): аб'яднаць Савецкую Літву і Беларусь у адну рэспубліку. Беларускім камуністам нічога не заставалася, як правесці гэтае рашэнне ў савецкім і партыйным парадку. Аднак, нягледзячы на тое, што ўсе планы бальшавікоў адносна Беларусі і Літвы былі рэалізаваны ў поўнай меры, пазбегнуць вайны з Польшчай не атрымалася. Зноў беларускім землям давялося стаць арэнай кровапралітных баёў і зведаць цяжкі прыгнёт цяпер ужо польскіх акупантаў.

З вясны 1920 г. сітуацыя на Заходнім фронце пачынае мяняцца на карысць Чырвонай Арміі. Да 11 ліпеня 1920 г., калі быў вызвалены Мінск, паўстала пытанне аб паўторным абвяшчэнні Беларускай рэспублікі. Многім у кіраўніцтве Літоўска-Беларускай рэспублікі здавалася, што, паколькі знешнепалітычная сітуацыя змянілася, няма ніякіх падстаў для аднаўлення рэспублікі. Аднак у ЦК РКП(б) вырашылі па-іншаму. Як і ў 1918 г., беларускае пытанне было цесна звязана з развіццём ваенных падзей. Летам 1920 г. Чырвоная Армія развівала імклівае наступленне, і кіраўніцтва РКП(б) ужо бачыла Савецкія войскі ў Варшаве і далей у Заходняй Еўропе. У гэтых абставінах ліквідаваць Беларускую рэспубліку — азначала пазбавіць Чырвоную Армію вобраза вызваліцеля прыгнечаных нацый.

31 ліпеня 1920 г. Ваенрэўком Беларускай рэспублікі, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі кампартыі, БКЛ і Бунда, выдаў «Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь». Тэрытарыяльнае ў ёй згадвалася толькі ў самых агульных рысах. Заходняя граніца акрэслівалася па этнаграфічнай граніцы паміж БССР і суседнімі капіталістычнымі дзяржавамі. А граніца Беларускай рэспублікі з Савецкай Расіяй і Украінай вызначалася свабодным выяўленнем волі беларускага народа ў згодзе з урадамі РСФСР і УССР [6, с. 416]. Такім чынам, дакладнае вырашэнне тэрытарыяльнага пытання пакідалася да лепшых часоў.



Created by free version of DocuFreezer

Аднак даволі хутка польская армія распачала контрнаступленне. Да канца верасня савецкія войскі былі вымушаны пакінуць Ліду і Баранавічы, а 15 кастрычніка — Мінск. Контрнаступленне Чырвонай Арміі напрыканцы восені было апошнім намаганнем сіл, пасля чаго канчаткова знясіленыя ў вайне Савецкая Расія і Польшча былі вымушаны заключыць перамір'е, якое фактычна зафіксавала сітуацыю, што склалася на фронце на момант падпісання дагавору. 18 сакавіка 1921 г., урады РСФСР і УССР падпісалі ў Рызе мірны дагавор з урадам Польшчы, у адпаведнасці з якім граніца паміж Польшчай і Беларуссю праходзіла ў некалькіх дзесятках кіламетраў на захад ад Мінска. У склад БССР уваходзілі толькі шэсць няпоўных паветаў Мінскай губерні: Бабруйскі, Барысаўскі, Мазырскі, Чэрвеньскі, частка Мінскага і Слуцкага. Тэрыторыя рэспублікі складала 52 398 кв.км., на якой пражывала каля 1,5 млн чалавек [7, 261].

Паўнацэннае развіццё Беларускай рэспублікі як сапраўднай дзяржавы ў вызначаных памерах было немагчыма. Адрыў цэнтральнай Беларусі ад усходніх губерняў, з якімі традыцыйна склаліся цесныя эканамічныя і культурныя сувязі, адмоўна ўплываў на ўсе бакі грамадскага развіцця: парушалася ўзаемадзеянне паміж рознымі галінамі вытворчасці, замаруджваўся працэс аднаўлення народнай гаспадаркі, узнікалі шматлікія перашкоды на шляху адраджэння нацыянальнай культуры і мовы. Тым не менш кіраўніцтва РКП(б) не спяшалася вырашаць пытанне аб вяртанні ўсходнебеларускіх губерняў у склад БССР. Восенню 1920 г. кіраўніцтва КП(б)Беларусі само прызнала вяртанне ўсходніх губерняў заўчасным у дадзеных знешнепалітычных абставінах. Зварот групы «камуністаў-беларусаў», падрыхтаваны імі па ўласнай ініцыятыве і ў пачатку студзеня 1921 г. накіраваны ў ЦК РКП(б), быў увогуле пакінуты без адказу.

Паколькі беларуская тэрытарыяльная праблема вырашалася пры непасрэдным удзеле цэнтральных і рэспубліканскіх



партыйных органаў і насіла на сабе адбітак усіх працэсаў, што адбываліся ўнутры кампартыі, ёсць аб'ектыўная неабходнасць больш глыбока прааналізаваць тыя фактары, што абумоўлівалі пазіцыю кіраўніцтва партыі па пытанні аб граніцах БССР. У першыя гады пасля заканчэння грамадзянскай вайны адносіны бальшавікоў да інтарэсаў маладых савецкіх рэспублік вызначаліся агульнай скіраванасцю іх палітыкі на сусветную рэвалюцыю. Думка аб хуткай перамозе сусветнай рэвалюцыі, знікненні граніц паміж рознымі дзяржавамі, а потым і саміх дзяржаў лічылася неаспрэчнай. На мір глядзелі як на з'яву часовую, як на магчымасць сабрацца з сіламі перад новым паходам. «Мы — проста салдаты ў паходзе. Мы спыніліся на адпачынак толькі на дзень», — пісаў у 1923 г. Л.Троцкі [8, с. 163]. Такі погляд быў характэрны і для мясцовых кіраўнікоў у рэспубліках. Так, на Х партыйнай канферэнцыі КП(б)Б восенню 1921 г. старшыня ЦВК БССР А.Чарвякоў адзначаў, што наступная зіма «дасць нам магчымасць падрыхтаваць такую Чырвоную Армію, якая не толькі здолее абараніць Савецкую Рэспубліку ад ... імперыялістычных дзяржаў, але здолее ў неабходных выпадках парушыць граніцы для таго, каб прыйсці ў тую ці іншую краіну на дапамогу рабочаму класу ў яго барацьбе супраць сваіх капіталістаў» [2, спр. 14, а.19].

Мір быў нетрывалы, у сувязі з гэтым існаванне рэспублік набывала ўмоўны характар: узмацненне ўнутрыпалітычнага і міжнароднага становішча Савецкай Расіі павінна было прывесці да знікнення самастойных рэспублік і аб'яднання іх у адну цэнтралізаваную дзяржаву. Аднак на шляху да непасрэднага ажыццяўлення гэтых планаў стаялі сур'ёзныя перашкоды. Перш за ўсё, існаванне «незалежных» рэспублік па-ранейшаму дазваляла ЦК РКП(б) праводзіць ад іх імя актыўную дыпламатычную і агітацыйную дзейнасць. Па-другое, кіраўніцтва кампартыі павінна было лічыцца з нацыянальным рухам, які ў пачатку XX ст. паўсюдна назіраўся на ўскраінах былой Расійскай імперыі, і з тым фак-



Created by free version of DocuFreezer

там, што ўнутры саміх рэспублік мелася шмат людзей, якія не хацелі разглядаць «існаванне незалежных рэспублік як гульню».

З утварэннем Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пачаўся новы этап працэсу вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР. Тэрытарыяльнае пытанне абмяркоўвалася на VII з'езде КП(б)Б і на II сесіі ЦВК БССР IV склікання. Пашырэнне тэрыторыі БССР за кошт усходнебеларускіх губерняў было прызнана неабходнай умовай далейшага развіцця рэспублікі [4, спр. 167, а.76]. Зыходзячы з гістарычнай, эканамічнай і этнаграфічнай агульнасці тэрыторыі, у склад пашыранай Беларускай рэспублікі, па плане ЦК КП(б)Б, павінны былі ўвайсці Віцебская і Гомельская губерні поўнасцю, а таксама Горацкі і Мсціслаўскі паветы Смаленскай губерні. Пры такім вырашэнні пытання тэрыторыя БССР склала б прыкладна 140 тыс. кв. вёрстаў з насельніцтвам больш за 5 млн чалавек [3, спр. 2549, а.16].

Аднак ініцыятыва беларускага ўрада выклікала рэзка адмоўную рэакцыю з боку кіраўніцтва адзначаных губерняў. У сваіх дакладах яно крытыкавала беларускі план і імкнулася даказаць яго беспадстаўнасць. Ставіўся пад сумненне беларускі характар насельніцтва ўсходніх губерняў, адзначалася адсутнасць сярод жыхароў цягі да беларускай культуры і мовы. У сітуацыі, калі статыстычныя даныя, прадстаўленыя супрацьлеглымі бакамі, былі недакладнымі, няпоўнымі і часта супярэчлівымі, вялікі ўплыў набывалі знешнепалітычныя фактары, на якія ўвесь час звярталася самая сур'ёзная ўвага. Беларускі бок імкнуўся пераканаць ЦК РКП(б), што правільнае вырашэнне тэрытарыяльнага пытання можа значна павысіць аўтарытэт БССР і яе ўплыў на падзеі ў Заходняй Беларусі [3, спр. 1, а.3].

29 лістапада 1923 г. Палітбюро ЦК РКП(б) разгледзела пазіцыю ўсіх зацікаўленых бакоў і пастанавіла далучыць да БССР Віцебскую і Гомельскую губерні цалкам, за выключэннем чатырох паветаў былой Чарнігаўскай губерні, а таксама Горацкі і Мсціслаўскі паветы Смаленскай губерні [3, спр. 656, а. 51].

Як бачым, рашэнне Палітбюро ЦК РКП(б) было даволі спрыяльным для Беларускай рэспублікі. Яно прадугледжвала стварэнне БССР у памерах, якіх, на самой справе, не ўдалося дасягнуць ні падчас першага, у 1924 г., ні нават другога, у 1926 г., пашырэння. На жаль, рашэнне Палітбюро ЦК РКП(б) не было рэалізавана ў поўнай меры. У момант, калі здавалася, што пытанне ўжо канчаткова вырашана, на шляху да яго практычнага здзяйснення ўзніклі непрадбачаныя перашкоды, звязаныя з дзейнасцю аднаго з лідэраў апазіцыі да ЦК РКП(б) сакратара ЦВК РСФСР і старшыні камісіі па раяніраванні РСФСР Ц.У.Сапронава. Ён абвінавачваўся ў тым, што імкнуўся аддзяліць савецкія органы ад партыйнага ўплыву. Ц.У.Сапронаў даказваў, што партыя «паглынае ініцыятыву і самастойнасць савецкіх органаў», і як прыклад прыводзіў беларускае пытанне, пра якое ён, сакратар ЦВК РСФСР і старшыня камісіі па раяніраванні, нічога не ведаў, а калі і чуў выпадковыя размовы па гэтым пытанні, то лічыў, што гэта толькі жарты аб «Вялікай Беларусі». Адначасова ў ЦК РКП(б) паступіў пратэст Віцебскага губкома, які выказваў сваё абурэнне тым, што пазіцыя партыйнай арганізацыі цэлай губерні была праігнаравана [3, спр. 2549, а. 105]. У гэтай сітуацыі Палітбюро ЦК РКП(б) было вымушана пайсці на перагляд свайго рашэння. У складзе РСФСР заставаліся тры паветы Віцебскай губерні, Гомельскі і большая частка Рэчыцкага павета Гомельскай губерні. З Мсціслаўскага павета Смаленскай губерні да БССР адыходзілі толькі чатыры воласці.

У выніку вяртання ўсходніх губерняў тэрыторыя рэспублікі павялічылася ў 1924 г. больш чым у два разы і склала 110 584 кв.км, а колькасць насельніцтва ўзрасла да 4,2 млн чалавек [12, с. 10]. Аднак, нягледзячы на заяву старшыні ЦВК БССР А.Чарвякова на VI Надзвычайным з'ездзе Саветаў БССР аб тым, што пасля пашырэння тэрыторыю рэспублікі складалі «ўсе тыя паветы, большасць насельніцтва якіх былі беларусы»,





Created by free version of DocuFreezer

тэрытарыяльнае пытанне ў 1924 г. не было вырашана канчаткова [13, с. 9].

Цяпер нам цяжка ўявіць, што Гомель ці Рэчыца маглі б лічыцца небеларускімі гарадамі. Аднак у пачатку 1924 г. такое становішча было рэальнасцю, і нішто не паказвала на магчымасць яго перагляду ўжо ў бліжэйшай будучыні. Патрэбны былі вельмі важкія прычыны, каб ужо праз два гады пасля пашырэння, названага канчатковым, зноў паставіць у вышэйшых партыйных органах праблему беларускіх тэрыторый. Аналіз архіўных матэрыялаў дае магчымасць сцвярджаць, што ў 1926 г. мелася цэлая група фактараў, якія не дазвалялі беларускім уладам зняць гэтае пытанне з парадку дня. Тым не менш, нягледзячы на ўсю важкасць знешнепалітычных фактараў, пераканаўчасць эканамічных прычын і справядлівасць нацыянальных патрэбаў, непасрэдным штуршком для актывізацыі намаганняў па вяртанні астатніх усходнебеларускіх зямель сталі спробы Арганізацыйнага Бюро Заходняй вобласці ў Смаленску зноў ажыццявіць праект па ўтварэнні Заходняй вобласці.

Першая спроба перагледзець вынікі пашырэння была зроблена ўжо ў хуткім часе пасля завяршэння працэсу прыёмкі-перадачы ўсходнебеларускіх паветаў. У жніўні 1924 г. Аргбюро сумесна з кіраўніцтвам Гомельскай губерні звярнулася ў ЦВК РСФСР з прапановай аб уключэнні ў склад вобласці Горы-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута разам з часткай прылеглай да яго тэрыторыі БССР. Па гэтым праекце назад да Смаленскай губерні павінны былі адысці шэсць беларускіх паветаў плошчай 909,9 кв.км і з насельніцтвам 45 600 чалавек [3, спр. 11, а.137]. Спробы перагледзець граніцы БССР працягваліся і ў 1925 г. Менавіта ў процівагу захадам Аргбюро ўрад БССР быў вымушаны выступіць з контрпрапановай яшчэ раз разгледзець пытанне аб граніцах Беларускай рэспублікі з мэтай канчатковага іх вызначэння. 17 сакавіка 1926 г. Бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла: катэгарычна пярэчыць супраць стварэння Заходняй вобласці, настойваць на далучэнні Гомеля



і Веліжа і ўстрымацца ад абмеркавання пытання аб Смаленску [3, спр. 99, а.129]. Па праекце беларускага кіраўніцтва да БССР павінны былі адысці Гомельская губерня цалкам і тры паветы Пскоўскай губерні: Веліжскі, Невельскі і Себежскі, якія да 1924 г. уваходзілі ў склад Віцебскай губерні [3, спр. 944, а.104].

Апускаючы прамежкавыя этапы вывучэння тэрытарыяльнага пытання ў вышэйшых партыйных і савецкіх органах РСФСР і БССР, засяродзім увагу на дзейнасці спецыяльнай камісіі ЦК УКП(б), якая з 6 па 15 кастрычніка працавала на Гомельшчыне. За гэты час камісія абследавала чатыры валасці Гомельскага павета і тры валасці Рэчыцкага. Яе члены сустракаліся з нізавым партыйным і савецкім актывам, праводзілі гутаркі з сялянамі і рабочымі, наведалі рускія і беларускія школы. У выніку былі зроблены наступныя вывады: большасць насельніцтва ў абследаваных двух паветах па паходжанні беларускае; гутарковая мова змешаная: рускія і беларускія словы; поўнасцю адсутнічае беларуская нацыянальная самасвядомасць і цяга да беларускай мовы; адносіны да беларусізацыі адмоўныя [3, спр. 99, а.150].

Як бачым, вывады камісіі былі не надта спрыяльнымі для беларускага бока. Аднак значную ролю ў гэтай сітуацыі адыграў знешнепалітычны фактар. Ва ўсіх сваіх зваротах, дакладах і лістах у ЦК РКП(б) кіраўніцтва БССР заўсёды падкрэслівала палітычны аспект праблемы. Адзначалася, што адмоўнае вырашэнне гэтага пытання можа нанесці шкоду рэвалюцыйна-вызваленчаму руху ў Заходняй Беларусі, а таксама паўплываць на пазіцыю беларускай інтэлігенцыі ў БССР. У адным з сваіх зваротаў у ЦК РКП(б) сакратар КП(б)Б А.Крыніцкі адзначаў, што сярод беларусаў замежжа і часткі інтэлігенцыі БССР знаходжанне «Гомельшчыны, часткі Пскоўшчыны і нават Смаленшчыны» ў РСФСР лічыцца такой жа несправядлівасцю, як і польскі прыгнёт у Заходняй Беларусі [3, спр. 98, а.20]. Сапраўды, пашырэнне тэрыторыі БССР у



Created by free version of DocuFreezer

1924 г. выклікала неадназначную рэакцыю за мяжой. Так, газета «Голас беларуса» ад 10 мая 1926 г. пісала: «... і нават самы апошні, здавалася б, дужа прыхільны для беларусаў акт далучэння да Савецкай Беларусі Віцебшчыны, Полаччыны і Магілёўшчыны, добра прыгледзеўшыся і разважыўшы, можна разглядаць як акт пятага падзелу Беларусі» [3, спр. 106, а.22].

Актыўная дзейнасць беларускіх уладаў дала пэўныя вынікі. 18 лістапада 1926 г. Палітбюро ЦК УКП(б) пастанавіла: «Лічыць даказаным беларускі характар насельніцтва Гомельскага і Рэчыцкага паветаў і прызнаць неабходным далучэнне адзначаных паветаў да БССР». Тры паветы былой Віцебскай губерні пакідаліся ў складзе РСФСР [3, спр. 98, а.10]. У выніку далучэння Гомельскага і Рэчыцкага паветаў тэрыторыя БССР павялічылася яшчэ на 15 727 кв.км, а яе насельніцтва — на 649 тыс. чалавек. На пачатак 1927 г. тэрыторыя рэспублікі складала 125 950 кв.км, дзе пражывала каля 5 млн чалавек, 80 % якога складалі беларусы [7, с. 364].

Характарызуючы ў цэлым працэс тэрытарыяльнага будаўніцтва БССР у 1919—1926 гг., трэба адзначыць яго наступныя рысы. На працягу разглядаемага перыяду пры вырашэнні тэрытарыяльнага пытання знешнепалітычны фактар адыгрываў галоўную ролю. З цягам часу, са змяненнем унутранага і міжнароднага клімату, яго ўдзельная вага памяншалася, аднак меркаванні палітычнага характару па-ранейшаму заставаліся вызначальнымі. І ў 1924, і ў 1926 гг. вяртанне ўсходнебеларускіх раёнаў у склад БССР звязвалася з развіццём сусветнай рэвалюцыі ў цэлым і з узмацненнем камуністычнай прапаганды і рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі ў прыватнасці.

Вырашэнне тэрытарыяльнага пытання адбывалася ў абставінах поўнай сакрэтнасці. Пры яго пастаноўцы кіраўніцтва БССР прытрымлівалася тактыкі паслядоўных зваротаў і пошуку прыхільнікаў у цэнтральных партыйных, савецкіх і гаспадарчых органах. Праблема беларускіх граніц спачатку



разглядалася ў ЦК УКП(б), і толькі пасля яе вырашэння ў партыйным парадку прынятая пастанова праводзілася праз саюзныя, рэспубліканскія і губернскія Саветы, роля якіх зводзілася да стварэння ўражання аб дэмакратычным характары вырашэння пытання.

Уключэнне ўсходнебеларускіх губерняў у склад БССР выклікала катэгарычны пратэст з боку мясцовых уладаў. Сваю пазіцыю яны абгрунтоўвалі тым, што большасць насельніцтва Віцебскай і Гомельскай губерняў з'яўляецца рускім ці русіфікаваным, адмоўна адносіцца да беларусізацыі і не жадае далучацца да БССР. У галіне культурнай працы сярод беларусаў усходніх раёнаў назіраліся шматлікія недахопы. Для работнікаў партыйных і савецкіх органаў беларуская мова была незразумелай і чужой альбо, яшчэ горш, з'яўлялася прыметай адсталасці і неадукаванасці. Кожны, хто выступаў за развіццё беларускай мовы, у вачах уладаў станавіўся нацыяналістам. Нярэдка прыхільнікаў усяго беларускага абвінавачвалі ў контррэвалюцыйнай прапагандзе. Зразумела, што гаварыць у гэтай сітуацыі аб высокім узроўні нацыянальнай самасвядомасці не прыходзілася.

Насельніцтва ўсходніх губерняў і нават радавыя камуністы былі пазбаўлены магчымасці ўдзельнічаць у абмеркаванні тэрытарыяльнага пытання. Адсутнасць інфармацыі і неафіцыйная агітацыя супраць далучэння да БССР, якая вялася мясцовымі ўладамі, прыводзіла да скажонага ўяўлення жыхароў аб беларусізацыі. Рабочыя і сяляне таксама хваляваліся, што аб'яднанне са слабай у эканамічным плане Беларускай рэспублікай пагоршыць іх эканамічнае становішча. Аднак сітуацыя кардынальна мянялася, калі насельніцтва трапляла ў атмасферу, спрыяльную для нацыянальна-культурнага развіцця, дзе беларуская мова і культура карысталіся павагай і падтрымкай з боку дзяржавы.

У цэлым жа вяртанне ўсходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР, пры ўсёй неадназначнасці ацэнак прынцыпаў



Created by free version of DocuFreezer

правядзення гэтага працэсу і яго вынікаў, значна ўзмацніла эканамічную базу Савецкай Беларусі, стварыла новыя магчымасці для далейшага гаспадарчага і сацыяльна-культурнага развіцця, павялічыла міжнародны аўтарытэт БССР, садзейнічала кансалідацыі беларускай нацыі.


1. НА РБ Ф.4, воп.1.
2. НА РБ Ф.4, воп.2.
3. НА РБ Ф.4, воп.21.
4. НА РБ Ф.6, воп.1.
5. Борьба за Советскую власть в Белоруссии (1918—1920): Сб. докл. и материалов: В 2 т. — Т.1. Февраль 1918 — февраль 1919 г. — Мн.: Беларусь, 1968.
6. Борьба за Советскую власть в Белоруссии (1918—1920): Сб. докл. и материалов: В 2 т. — Т. 2. Февраль 1919—1920 г. — Мн.: Беларусь, 1971.
7. Гісторыя БССР: У 5 т. — Мн., 1973. — Т. 3; Гісторыя БССР: У 5 т. — Мн., 1973. — Т. 3.
8. *Коэн С.* Бухарин. Политическая биография. 1888—1938. — М. — Мн., 1989.
9. *Круталевіч В.* Пасля абвяшчэння рэспублікі // Полымя. — 1969. — № 9.
10. *Маргунский С.П.* Создание и упрочение белорусской государственности. — Мн., 1958.
11. Пратакол I з'езда КП(б)Б. — Мн., 1934.
12. Справаздача ўраду БССР VII Усебеларускаму з'езду Саветаў. — Мн., 1925.
13. VI Всебелорусский Чрезвычайный съезд Советов. Стенографический отчет. — Мн., 1924.




Created by free version of DocuFreezer